СОВМИН НАШЁЛ КРАЙНИХ?

СТР. 2

З БРЭСЦКАЙ ВУЛІЦЫ – НА ТАПАЛЁВУЮ

СТАР. 3

ПЯТЬ ВЕЩЕЙ, КОТОРЫЕ СТОИТ КУПИТЬ В КРИЗИС

СТР. 7

Газета Слонімская

Упершыню выйшла ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Масава-палітычны штотыднёвік

Выдавец УП "Газета Слонімская" Выходзіць адзін раз на тыдзень Заснавана 24 сакавіка 1997 года

№30 (633) Серада, 22 ліпеня 2009 года www.gs.by

МИНСК ГРОДНО
ПРОФЕССИОНАЛЬНЫЕ пассажирские перевозки
222-99, 250-05, 505-55
615-14-99, 788-14-99
Лиц. № 02190/0477771, 03.01.2007-02.01.2012 МТК и К РБ, УП "Мронгур" УНП 590789572

■ КОНКУРС «МОЙ РОДНОЙ УГОЛОК»

ЛЮБИМОЕ ДЕЛО ДЛЯ ДУШИ

Продолжение на стр. 12

ГРОДНО 44-2-88
8-029-70-44-2-88, 8-029-123-42-88.
МИНСК
УНП 590432802 ИП Юрцев И.В. Лиц.№ 9-02076, до 22.02.2019, МТК РБ

ПОЕЗДКИ В ГРОДНО
5-24-45
8-029-883-45-35
622-55-90 (МТС)
8-029-354-91-64,
8-029-186-86-55.
посадка с вашего места жительства
Принимаем коллективные заявки
Лиц.№02190/038 8589, от 24.06.06-05.01.12г. ИП Павловский И.С., УНП 590420411

Поездки МИНСК Гродно
4-43-29
ПОСАДКА В ЛЮБОМ МЕСТЕ ГОРОДА
ПРИНИМАЕМ КОЛЛЕКТИВНЫЕ ЗАЯВКИ
Ежедневно, быстро, удобно
8 (029) 685 33 32 8 (029) 785 44 88
Лиц. № 02190/0425533, 22.02.08 г.- 22.02.13 МТК РБ УНП 590084557 Клок Д.Д.

Пассажирские перевозки по РБ
Гродно
коллективные заявки
Наличный, безналичный расчет.
Тел.: 4-43-48,
8-029-690-82-93, 8-029-588-29-83.
Лиц. №02190/0311130, 18.02.2006г.-17.12.2016г., МТК РБ УНП 590092742 ИП Рыжак М.И.

МЕТАЛЛ ПРОФИЛЬ
100% комплектации
Теперь можно в кредит
МЕТАЛЛОЧЕРЕПИЦА
ПРОФНАСТИЛ
ВОДОСТОЧНАЯ СИСТЕМА
г. Барановичи ул. Ленина,49 (возле стадиона)
VELCOM 8 /029/ 683-69-99
МТС 8 /033/ 673-69-99
тел/ф 8 /0163/ 45-29-91
УНП 290265870, ИП Смоленский А.В. товар сертифицирован Лиц. № 14100/0262436, 28.03.06.–28.03.2011 г. Бар. ГИК

Наш адрес в Интернете

www.gs.by

ПОЕЗДКИ Минск–Гродно
Тел.: 2-42-27, 6124227, 2803300.
Лиц. №02190/0399958, 29.10.2007г.-28.10.2012г. МТК РБ УНП 500532899 ИП Столярчук А.В.

Поездки Гродно
вокзал, рынок, больницы
МИНСК
Тел.: 4-43-38
8-029-284-42-73, 884-25-08.
Лиц. № 02190/0339767, 18.09.2006г.-17.09.2011г., МТК РБ ИП Сикорский Г.В., УНП 590094015

МЕБЕЛЬ • ДВЕРИ МЕТАЛЛИЧЕСКИЕ • НАТЯЖНЫЕ ПОТОЛКИ
г. Слоним, Красноармейская, 42 (в м-не «Книги», возле м-на «Рубин»)
вт. – пт.: 10.00 – 18.00, сб. – вс.: 9.00 – 15.00, пн. – выходной
2-51-41, 8-029-169-51-48
Лиц. №42540/0466058, 27.12.2007 – 27.12.2012 СРИК УНП 590719077, ЧТПУП "ЮриксБел"
www.profilistilist.by

МАГАЗИН ГРАДУС
ОТОПЛЕНИЕ И САНТЕХНИКА
газовые котлы и колонки
электроводонагреватели
стабилизаторы напряжения
радиаторы отопления
трубы и фитинги
мойки, умывальники,
ванны и душевые кабины
мебель для ванных комнат
канализация и водопровод
ул. Я. Купалы, 5
(029) 123-44-55
ЧПТУП "АльфаМагер" УНП 590833491, Лиц № 42540/0532212 СРИК 27.05.09-27.05.13 г.

ПОЕЗДКИ в г. ГРОДНО
5-28-23
281-83-73
315-98-66
667-37-85
Принимаем коллективные заявки
Лиц. 02190/0425028, 22.02.08-11.03.2013 МТК РБ ИП Анисько Т.Н. УНП 590084409

ГРОДНО
вокзал, рынок, больницы
МИНСК
4-27-45
8-029-782-85-28
8-029-601-06-82
Лиц. №02190/0213469, 01.04.2005-31.03.2010 г., МТК РБ УНП 500492192 ИП Фефёлкина Т.Н.

МЕТАЛЛ ПРОФИЛЬ
г. Барановичи, ул. Комсомольская, 22, (2 эт.)
- МЕТАЛЛОЧЕРЕПИЦА
- ВОДОСТОЧНЫЕ СИСТЕМЫ
- ПРОФНАСТИЛ
- МАНСАРДНЫЕ ОКНА
- ГИДРО-, ПАРОИЗОЛЯЦИЯ
- ОНДУЛИН
- НАРУЖНЫЙ САЙДИНГ
ЗАМЕР, ДОСТАВКА, КОНСУЛЬТАЦИЯ СПЕЦИАЛИСТОВ, ФОРМА РАСЧЁТА ЛЮБАЯ, НАЦЕНКА 0
т\ф 8 0163 42-44-60, т\м 8 029 672-12-94
ЧТУП "Стройинтерьер" УНП 2904855530. Товар сертифицирован

Поездки в Минск Гродно
Быстро, удобно
Надёжно
Контакты
8-015-62-4-70-85
8-029-664-14-62
8-029-582-58-90
Лиц.№02190/0415022, 30.11.2007 -13.12.2012,МТК РБ ЧТУП Фриптуляк С.В. УНП 590718558

ЗДАРЭННІ

АПУСТОШЫЎ СТЭНД

З выставачнага стэнда крамы “Майстар”, што ў будынку БТІ на вуліцы Янкі Купалы, 5, зніклі электрычная разеткі.

Работнікі міліцыі высветлілі, што стэнд з ўзорамі разетак, якімі гандлюе крама, падчысціў адзін з жыхароў горада. Супраць мужчыны ўзбудзілі крымінальную справу.

АБАБРАЛІ ПЕНСІЯНЕРА

У хату да пенсіянера ў вёсцы Ферадкі зайшлі некалькі асобаў цыганскай знешнасці і прапанавалі набыць у іх рэчы.

Пасля зыходу няпрошаных гасцей вясковец недалічыўся 1 млн. 900 тысяч беларускіх рублёў і 700 даляраў ЗША.

Па факце крадзяжу грошай у пенсіянера 15 ліпеня праваахоўнікі завялі крымінальную справу. Міліцыя шукае злодзеяў.

ЗНІКЛІ КРЭСЛЫ З ПАДВОРКА

Тры крэслы зніклі нядаўна з вясковага падворка ў Вераб’евічах. Гаспадары хаты заявілі пра тое ў міліцыю.

14 ліпеня па заяве пацярпелых узбудзілі крымінальную справу.

ПАДЛІЧЫЛІ СТРАТЫ

Ахоўнікі правапарадку падлічылі, што начныя рабаўнікі вынеслі з крамы ў вёсцы Шылавічы тавараў на 640 тысяч рублёў.

16 ліпеня па факце крадзяжу з крамы ўзбудзілі крымінальную справу. Вядзецца пошук злодзеяў.

Мікола КАНАНОВІЧ

■ ЭКОНОМИКА

СОВМИН НАШЁЛ КРАЙНИХ?

На прошлой неделе ряд белорусских СМИ сообщили о том, что Совет Министров предложил председателям облисполкомов в установленном порядке освободить с 15 июля 2009 года от занимаемой должности директора ОАО «Слонимский мясокомбинат» Вячеслава Наруту, а также директоров ОАО «Оршанский молочный комбинат» В.В. Грабовского, ОАО «Октябрьский завод сухого обезжиренного молока» М.Л. Шейко, ОАО «Слуцкий сыродельный комбинат» В.Н. Латыговского, ОАО «Быховмолоко» Н.Н. Козюлько.

Такое решение связано с тем, что по результатам работы за январь-апрель 2009 года молочные предприятия не выполнили задания по уровню рентабельности реализованной продукции. Долгое время на молочных предприятиях в Орше, Слуцке, Быхове не проводилась глубокая реконструкция, смена ассортимента продукции, и, как следствие, им нанесен ущерб от продажи продукции в убыток.

Что касается «Слонимского мясокомбината», то в готовой продукции нашего предприятия Федеральная служба по ветеринарному и фитосанитарному надзору Российской Федерации якобы обнаружила антибиотики. Вследствие этого, он был исключен из перечня организаций, имеющих право экспортировать в Россию продукцию животного происхождения.

В понедельник, 20 июля, корреспондент «ГС» попросил директора ОАО «Слонимский мясокомбинат» Вячеслава Наруту прокомментировать сложившуюся ситуацию. Вячеслав Константинович категорически не согласен с тем, что в мясной продукции нашего мясокомбината присутствуют антибиотики. Ещё Вячеслав Константинович подтвердил, что он пока остаётся в должности руководителя открытого акционерного общества «Слонимский мясокомбинат».

Сергей ЧИГРИН

НОВОСТИ ОТ «ВИНСЕНТА»®
(СЛОНИМСКИЙ ВИНОДЕЛЬЧЕСКИЙ ЗАВОД)

Недавно предприятие в составе концерна «Белгоспищепром» представляло Республику Беларусь на Национальной выставке Беларуси в г. Варшаве, основной целью, которой является расширение торгово-экономических связей между соседствующими странами. По результатам выставки предприятие было отмечено дипломом «За активное участие» и достигло определенных договоренностей для дальнейшего сотрудничества.

На предприятии появились новинки – грузинская продукция «Саперави» и «Алазанская долина». Виноградная продукция, изготовленная из сорта винограда «Саперави», — одна из самых распространенных в Грузии и является ее визитной карточкой. Продукция представлена в розничной сети города. Также освоен выпуск алкогольной продукции «Лимонный люкс», в состав которой входит экстракт лимона.

Данная продукция также представлена в розничной сети города.

ЧРЕЗМЕРНОЕ ПОТРЕБЛЕНИЕ АЛКОГОЛЯ ВРЕДИТ ВАШЕМУ ЗДОРОВЬЮ

ДЕЖУРНЫЙ ПО ГОРОДУ

ВАШИ НОВОСТИ — В ВАШЕЙ ГАЗЕТЕ

Уважаемые читатели «Газеты Слонімскай”!

Давайте вместе делать газету. Если вы стали свидетелем или участником интересного события, происшествия, если на ваших глазах происходит нечто, что, по-вашему, заслуживает внимания, звоните нам по телефону 8-029-39-39-333 (Велком).

Мы тут же приедем!

Звоните в любое время!

КУРСЫ ОБМЕНА ВАЛЮТ
21.07.09

Беларусбанк	Покупка	Продажа
1 USD	2850	2885
1 EURO	4000	4094
1 ZL	917	954
1 RUR	88,4	91,5
Белпромстройбанк	**Покупка**	**Продажа**
1 USD	2860	2885
1 EURO	4020	4090
1 ZL	900	950
1 RUR	90	92
Белагропромбанк	**Покупка**	**Продажа**
1 USD	2860	2880
1 EURO	3980	4060
1 ZL	890	960
1 LAT	5000	5770
1 LIT	1000	1180
1 RUR	88,5	91,3
GBP	4000	4700
Белгазпромбанк	**Покупка**	**Продажа**
1 USD	2850	2885
1 EURO	4030	4130
1 RUR	90	91,5
Москва — Минск	**Покупка**	**Продажа**
1 USD	2830	2885
1 EURO	4020	4090
1 RUR	89	94
Приорбанк	**Покупка**	**Продажа**
1 USD	2850	2872
1 EURO	4015	4110
1 RUR	89	94
Нацбанк РБ		
1 USD	2824	
1 EURO	4014,07	
1 RUR	90,17	
1 ZL	935,96	

Цены на Слонимском рынке по состоянию 21.07. 2009

Наименование	Цена за 1 кг
Молоко (1 л)	1 500 руб.
Творог	7 000 руб.
Масло	16 000 руб.
Яйца (1 дес.)	1 770 - 4 000 руб.
Картофель (свеж.)	1 200 - 1 300 руб.
Капуста свежая	600 - 800 руб.
Морковь	2 500 руб.
Лук	2 300 - 2 500 руб.
Свёкла	1 500 руб.
Чеснок (за головку)	300 - 800 руб.
Помидоры	3 000 - 3 500 руб.
Бананы	3 700 руб.
Яблоки	4 500 - 5 500руб.
Апельсины	4 000 - 4 500 руб.
Огурцы	500 - 900 руб.
Мандарины	6 500 - 6 800 руб.
Лимоны	5 200 - 5 700 руб.
Виноград	6 500 - 9 700руб.
Киви (1 шт.)	550 - 700 руб.
Грейпфруты	5 500 - 6 000руб.
Персик	5 800 - 6 800 руб.
Груши	7 000 - 7 500 руб.
Говядина	17 630 - 20 540 руб.
Свинина	14 430 - 20 720 руб.
Сало (бочок)	9 300 руб.
Солёное	12 000 руб.
Сельдь	6 000 руб.
Макаронные изделия	2 200 - 2 500 руб.
Гречка	1 800
Рис	2 800 - 3 200 руб.
Подсолнечное масло (1 л)	3 300 - 3 600 руб.
Мёд	20 000 руб.
Арбузы	1 800 руб.
Черешня	5 500 - 8 000 руб.

салон мебели Анастасия
• кухни
• шкафы-купе
• стенки
• спальни и др.
8-029-654-52-44
2-13-39
ЧПТУП "АльфаМагер" УНП 590833491, Лиц № 42540/0532212 СРИК 27.05.09-27.05.13 г.

http://
www.gs.by
forum.gs.by

ОКАЗЫВАЕТСЯ
правозащитная помощь
по тел. 8-029-281-22-04

САНТЕХНИКА
Не упустите возможность приобрести по супернизким ценам
Трубу канализационную, полипропиленовую, полиэтиленовую, металлопластиковую, радиаторы алюминиевые 16Атм РП, а также в продаже: полотенцесушители, унитазы, мойки, водонагреватели, системы очистки воды, смесители и все комплектующие к ним фитинги.
ВЕСЕННЕЕ ПРЕДЛОЖЕНИЕ:
при покупке ванны, душкабины, умывальника - ПОДАРОК.
Ежедневно с 8.00 до 15.00 на центральном рынке пав. Сантехника и Сантехника плюс
Тел. 8-029-680-25-29, 8-029-65-20-471.
Товар сертифицирован Лиц. 42540/0087375, по 27.12.2012 г., СРИК ЧП "ВалерАН". УНП 590789304.

"Троя"
Ворота Козырьки
Калитки Ограды
Ограждения
РАССРОЧКА КРЕДИТ
Velcom 666-75-28
Свид. №50614, от 08.06.2005 г., Баран. ГИК. УНП 290416202 ИП Малевич С.А.

СЛОНИМ: НАШИ ЛЮДИ

Мини-рынок на Брестской улице перестал существовать. Корреспонденты «ГС» спрашивали местных жителей: «Что вы можете сказать относительно закрытия мини-рынка на Брестской улице?»

Мария Васильевна:

— Приходят пенсионеры, приходят старички. Она вся трясётся: «Бананчика хочу», — а бананчика нет. Овощного магазина здесь тоже нет — оно здесь всё было необходимо. Не знаю, кому это надо? У нас говорят, что всё для людей, а на самом деле…

Альбина Михайловна:

— Очень неудобно, что перенесли рынок на Ершова. Не то чтобы здесь было дешевле, скорее было удобно. Я была всегда против того, чтобы этот рынок отсюда убирали.

Не назвалась (без фотографии):

— Ну, закрыли этот рынок, а что взамен? Вот в Австрии в любом городке есть вертолётная площадка для скорой помощи населению. Пускай откроют вертолётную площадку на газопроводе. Тогда мы, жители микрорайона, увидим, что заботятся о нас власти.

Мнение пожилых женщин. Не назвались (без фотографии):

— Укропчик, лучок — раньше всё это было на мини-рынке, а сейчас нет, придется ехать на городской рынок или идти на улицу Ершова, где открылся новый мини-рынок. Нам, пожилым людям, это неудобно.

Мужчина средних лет. Не назвался (без фотографии):

— Всё нормально, так и надо. Хоть чистота будет в этом месте. Справа магазин, слева, на месте этого рынка можно будет площадку сделать для подъезда автотранспорта. Никаких проблем. Всё хорошо, конечно. Шалман, понимаешь, развели здесь. А теперь наведут порядок. Приятно будет посмотреть. Кому надо, съездит на городской рынок и там всё купит.

Не представился (без фотографии):

— Вот такая аналогия. Я из города Чечерска Гомельской области. Там председатели райисполкомов занимаются тем, что строят дома, а перед уходом со своего места они продают эти дома. Вот две фамилии. Был такой Зарецкий, покойник, построил домик — продал перед уходом. Вместо него пришёл Максименко. Тоже построил домик, продал и ушёл. Я отвечаю за свои слова. Сейчас то же самое будет делать третий. По Слониму получается другая картина: здесь рынки. Был один председатель райисполкома — открылся рынок, стал другой председатель — закрылся рынок. Так мне кажется. Хотя знаете — всем не угодишь.

Сергей Иванович:

— Проблемы имеются. Шестнадцатый магазин, конечно, стоит на хорошем месте. Чуть дальше — магазин «Тысяча мелочей», а рядом выкупили часть здания. Ничего не делают с полгода, больше, наверное. Но овощного магазина здесь нет. В шестнадцатом магазине есть, конечно, овощной отдел, но там далеко не всё, овощной продукции там явно мало.

Не назвалась:

— В больших городах всегда при магазинах есть какие-то рыночки, был и у нас здесь. А экология, машины, загазованность — они везде. Борись с этим, не борись, но закрытием рынка положение не исправишь.

Александра:

— Здесь, на этом рынке, покупали по пути домой. Теперь придётся покупать в городе или идти на Ершова. Не знаю, что там будет, на том рыночке. Палатки вроде перенесли отсюда.

Не представилась (без фотографии):

— Мне было удобно. В это время года я привыкла покупать нектарины, персики. Сейчас всё это надо искать в другом месте. Конечно, я бы хотела, чтоб этот мини-рынок оставался на своём месте.

Неизвестная (без фотографии):

— Всё зависит от того, кто где живёт. Те, кто живёт рядом, затоваривались в магазине и на этом рыночке. Я вот живу ближе к мини-рынку на Ершова, и мне будет удобно покупать там.

Владимир ШУМЕЛЬ
Фото Сергея ВАСИЛЬЕВА

■ ГОРАД

З БРЭСЦКАЙ ВУЛІЦЫ — НА ТАПАЛЁВУЮ

ФОТА СЯРГЕЯ ВАСІЛЬЕВА

Пасля 15 гадоў існавання міні-рынак, што знаходзіўся на Брэсцкай вуліцы ў Слоніме, пераехаў на Тапалёвую вуліцу.

Праўда, перавезлі свае гандлёвыя кропкі на рынак "Наш край" не ўсе прадпрымальнікі. Некаторых з іх не задавальняюць умовы працы на новым месцы.

Як будзе складвацца лёс новай гандлёвай пляцоўкі, пакажа час. Аднак вядома, што на старым месцы рынка ўжо не будзе.

Сяргей ЧЫГРЫН

Рынак перавезлі на Тапалёвую вуліцу ФОТА СЯРГЕЯ ВАСІЛЬЕВА

ЗДАРЭННІ

КРАДУЦЬ У ГАСЦЯХ

Падчас гасцявання ў вёсцы Драпава раней падсудны слонімец украў у гаспадароў хаты грошы.

Тым часам жыхарка Слоніма гасцявала ў адной з кватэр на вуліцы Чарняхоўскага і прыхапіла там грошы і наручны гадзіннік.

Праз некалькі дзён жыхар вёскі Дзераўная гасцяваў у кватэры на вуліцы Яршова ў Слоніме і прыхапіў там у гаспадароў 200 тысяч рублёў.

Па ўсіх гэтых фактах супрацоўнікі няўдзячных гасцей на мінулым тыдні завялі крымінальныя справы.

ЗБІЎ ЖАНЧЫНУ І ЯЕ ГОСЦЯ

На мінулым тыдні на Брэсцкай вуліцы ў Слоніме мясцовы жыхар збіў сланімчанку і жыхара Чэхіі, які гасцяваў у жанчыны.

Супрацоўнікі зламысніка 17 ліпеня праваахоўнікі завялі крымінальную справу.

І КАМЯНІ СПАТРЭБІЛІСЯ

Каму спатрэбіліся бардзюрныя камяні, якія днямі зніклі з Лясного завулка ў Слоніме, цяпер высвятляюць работнікі міліцыі.

Па факце крадзяжу бардзюрных камянёў 18 ліпеня ўзбудзілі крымінальную справу.

Мікола КАНАНОВІЧ

товар сертифицирован
ОКНА ПО КАРМАНУ
г Барановичи 1 переулок Защитный 18 офис 33
Тел Велком 8(029)942-45-54
Тел в г. Слониме Велком (044) 7799321, 8-029-9424554
5 лет
АНТИКРИЗИСНЫЕ ЦЕНЫ
УНН 290487450, ЧТУП «ВитТехно», ИП Судинко В.Л., УНН 200428648, Лиц. 14100/0445666, 17.03.09–17.03.14 г. БарРИК

Кровельные материалы
Тепло- и гидроизоляционные материалы
Водосточные системы
Сайдинг
Окна из ПВХ
Мансардные окна
ИП Ващенко Е.А. Лиц № 44010/1026969, 10.08.04-09.08.09 г. Гродн. ГИК

РОЛЛЕТЫ
ВОРОТА
КОВАНЫЕ ИЗДЕЛИЯ
655-67-17 41-02-28
РОЛЛЕТНЫЕ - СЕКЦИОННЫЕ
ОТКАТНЫЕ - РАСПАШНЫЕ
АВТОМАТИКА, металлопрофиль

салон мебели
Альфа
дом быта 2 этаж
Настоящие ортопедические матрацы
ВЕГАС, ЦВЕТНЫЕ СНЫ, БАРРО
И НЕОБЯЗАТЕЛЬНО ДОРОГО
8-029-654-52-44
2-13-39
ЧПТУП "АльфаМагер" УНП 590833491,
Лиц № 42540/0532212 СРИК 27.05.09-27.05.13 г.
товар сертифицирован

ВНИМАНИЮ ОРГАНИЗАЦИЙ И ФИЗИЧЕСКИХ ЛИЦ, МЕБЕЛЬ ПО ИНДИВИДУАЛЬНОМУ ЗАКАЗУ АНМИКС ТЕЛ.80296220791, 80296914692
ЧУП «Анмикс» Лиц. 42540/0466067 от 30.10.08, УНП 590096116

■ СПАЖЫВЕЦКІ КОШЫК

КАНСЕРВУЕМ, МАРЫНУЕМ...

“Калі прыбраць усе бюракратычныя перашкоды і даць гандлю такія ўмовы, каб ён не працаваў стратна, то цэннікі ў крамах маглі б упасці на 5-10%, а калі адкрыць рынкі для сусветных прадуктаў харчавання, то і зусім на 30-50%. Тады літр малака ў нас каштаваў бы ў сярэднім 1000 рублёў, бохан хлеба — 800, а кілаграм “Доктарскай” — 8000 рублёў”, — сказаў нядаўна ў інтэрв’ю “Камсамольскай праўдзе ў Беларусі” старшыня Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальнікаў, кіраўнік прыватнага гандлёвага прадпрыемства Віктар Маргелаў.

Але такая перспектыва інтэграцыі беларускага рынку ў сусветны выглядае сёння вельмі аддаленай, і мы мусім плаціць за харчы ў Беларусі, сыходзячы з мясцовых рэаліяў. А паколькі цэны на прадукты ў нас самыя высокія ў Еўропе, а заробкі ці не самыя нізкія, то беларусы проста вымушаны актыўна займацца збіральніцтвам даро ў лесу, прысядзібнай і дачнай гаспадаркай ды нарыхтоўкамі на зіму розных марынадаў і кансерваў. Апошняе якраз набірае актуальнасць. Таму на мінулым тыдні карэспандэнт “ГС” заглянуў на цэнтральны рынак і ў крамы ды пацікавіўся, што і колькі каштуе для кансервавання гародніны на зіму.

Самыя папулярныя для закаткі ў нас — агуркі ды памідоры. Гэтыя прадукты каштавалі на рынку па 1 500 і 3 500 рублёў за 1 кг адпаведна. Магчыма, на памідоры цэны яшчэ знізяцца, калі яны пачнуць актыўна паспяваць на градах мясцовых жыхароў. А вось для агуркоў цяпер — самая пара, і наўрад ці яны ў хуткім часе істотна патаннеюць, адзначалі гандляры гароднінай.

Смачна!

Кілаграм жоўтага перцу і баклажанаў прадавалі на рынку па 4000 рублёў. А вось папулярны і любімы многімі для марынадаў чырвоны перац каштаваў ажно 13000 рублёў за 1 кг. Відавочна, для марынавання гэтых прадуктаў час яшчэ не наступіў і бліжэй да восені тут варта чакаць зніжэння коштаў.

Аднак справа кожнага, што яму назапашваць на зіму. Іншая справа — у што?

Тым разам аўтар гэтых радкоў знайшоў на рынку адна- і трохлітровыя слоікі па 1 400 рублёў за штуку. Шкляны посуд ёмістасцю 2 літры каштаваў 1 200 рублёў, а слоік змяшчальнасцю 1,5 л прадавалі па 1000 рублёў.

Закатачныя крышкі на рынку можна было набыць па 140 рублёў за штуку. Гэта мінімальны кошт.

Асноўныя дапаможныя прадукты пры кансерваванні — соль, цукар і воцат. Цукар нядаўна падаражэў і каштаваў у краме (на рынку не прадаюць) 2110 рублёў за 1 кг. Соль з ёдам у бліжэйшай ад рынка краме прадавалі па 420 рублёў за кілаграм, звычайную — па 350 рублёў. Літр воцату там каштаваў 3250 рублёў.

Калі да пералічанага вышэй дадаць кроп, іншую зеляніну і прыправы, якія звычайна каштуюць да 1 тысячы рублёў за невялікую ўпакоўку ці пучок, то можна пачынаць кансервавание. У колькі вам абыдзецца такое задавальненне, можаце падлічыць, выбраўшы пэўную колькасць прадукту і слоікаў для яго кансервавання.

Мікола КАНАНОВІЧ

ГРАМАДСТВА

ШКОЛА МАЛАДОГА ЖУРНАЛІСТА ПРЫЗНАНА “НЕЗАКОННАЙ”

Слонімская Школа маладога журналіста (ШМЖ) працавала на працягу некалькіх гадоў. За гэты час яна выхавала як сапраўдных журналістаў, так і людзей іншых прафесій, якія проста цікавяцца журналістыкай. Таму што гэта не толькі папулярная сярод моладзі прафесія, але яшчэ і школа грамадзянскай адукацыі.

Але зусім нядаўна арганізатар школкі грамадскі актывіст Алесь Масюк атрымаў афіцыйнае папярэджанне ад пракуратуры за «незаконныя» заняткі з моладдзю. У Слонімскай раённай пракуратуры палічылі, што сябра Беларускай асацыяцыі журналістаў (БАЖа) дапусціў сур’ёзныя парушэнні, паколькі праводзіў заняткі з дзецьмі «без рэгістрацыі, то бок незаконна», ды яшчэ і ў памяшканні, якое «не адпавядае патрабаванням санітарнай і пажарнай бяспекі».

“Ніколі не думаў, што за такую добрую справу атрымаю папярэджанне. Па логіцы рэчаў, павінна быць наадварот. Мне здавалася, што ўлады ўсяляк павінны падтрымліваць такога роду дзейнасць і спрыяць ёй, — пракаментаваў гэтую сітуацыю спадар Масюк.

Па ягоных словах, асноўнае парушэнне з яго боку — гэта тое, што заняткі праводзіліся на прыватнай кватэры.

“Але хто ж у гэтым вінаваты? Мы і самі зацікаўлены праводзіць заняткі ў іншым прыдатным памяшканні. Аднак на працягу некалькіх апошніх гадоў прадстаўнікам недзяржаўных грамадскіх аб’яднанняў знайсці памяшканне для правядзення нейкіх мерапрыемстваў амаль немагчыма. Таму мы і праводзім заняткі на прыватнай кватэры, якая была адмыслова падрыхтавана для гэтага. Ды і ўвогуле нейкі абсурд: праводзіць масавыя гулянні на кватэры не забаронена, а вось ладзіць гурток раз па дзве гадзіны у тыдзень — “незаконна”, — пракаментаваў гэтую сітуацыю Алесь Масюк.

Арганізатар школкі звяртаўся ва ўпраўленне адукацыі з пытаннем: што рабіць далей? Яму параілі надалей узгадняць месца і план заняткаў школкі, але па якім такім законе ён абавязаны гэта рабіць — ніхто не паказаў.

Нагадаем, што пракурорская праверка дзейнасці Школы маладога журналіста распачалася ў красавіку гэтага года — пасля таго, як супрацоўнік аддзела выхаваўчай і сацыяльнай работы ўпраўлення адукацыі горада Слоніма Максім Маслаў наведаўся на заняткі мясцовай школкі.

Спадар Маслаў патлумачыў, быццам нагодай для «праверкі» стаў той факт, што апошнім часам у Слоніме актыўна распаўсюджваецца нелегальная літаратура — улёткі. Таму на чарговым пасяджэнні Слонімскага райвыканкама было ўзнята пытанне: чым займаюцца навучэнцы школы маладога журналіста і ці не маюць яны дачынення да выдання забароненых матэрыялаў?

Насамрэч маладыя журналісты не маюць ніякага дачынення да гэтых улётак. Маладыя людзі на занятках вывучалі асновы журналістыкі, і нічога акрамя гэтага. А ў якасці практычных заняткаў яны маглі друкаваць свае матэрыялы ў “Газеце Слонімскай” і выдаваць уласную газету. Да таго ж, дзякуючы менавіта Слонімскай ШМЖ, некаторыя хлопцы і дзяўчаты абралі свой шлях і сталі сапраўднымі журналістамі, працягнуўшы вучобу на факультэце журналістыкі БДУ.

Сяржук МАЛАНКА

P.S.

Аўтар гэтых радкоў і сам некалі скончыў такую школку, пасля чаго стаў журналістам. Таму паўстае пытанне: “Ці варта закрываць ўсё на корані і не даваць магчымасці маладым людзям знайсці сябе?”

ПРОИСШЕСТВИЯ

В СЛОНИМЕ ЗАДЕРЖАН ГРАБИТЕЛЬ, УДАРИВШИЙ ТОПОРОМ ПРОДАВЩИЦУ

В Слониме задержан грабитель, который несколько раз ударил топором по голове продавщицу магазина в деревне Тартаки, что у Барановичей. Им оказался 19-летний житель Гродно.

При нём были топор (который он, кстати, украл у лесников), колбаса, батон, сладкая вода и 200 тысяч рублей.

36-летняя продавщица сейчас в реанимации в тяжёлом состоянии.

Еврорадио

■ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ЧИСТОТА КВАРТИРЫ НАЧИНАЕТСЯ С ПОРОГА

Не каждый из жильцов многоэтажных домов может похвастаться чистыми подъездами. Я могу привести в пример свой кооперативный дом, который был сдан в эксплуатацию в 1995 году. Сразу после заселения лестничные площадки в подъезде убирали сами жильцы, правда, графика уборки не было, а если он и вывешивался, мало кто обращал на него внимание. Поэтому одним приходилось убирать постоянно, а другие просто перешагивали через всю грязь, но рук не прикладывали. Понятно, кому хочется убирать чужие плевки и окурки? Да и отношение к чистоте у каждого свое. Сейчас ситуация в нашем доме изменилась: подъезд убирает еженедельно сотрудница ЖЭСа Полина Тимофеевна Нюфтикова, за что ей низкий поклон, избавила она нас от забот по уборке. В доме поменяли входную дверь, поэтому чужим попасть стало сложнее, котов бродячих нет, которые постоянно гадили, а соответственно, исчез и специфический запах. Однако бытовая культура наших жильцов выше не стала. Видимо, в сознании твердо закрепились привычки: никто меня не видит, и я это сделаю, или видят, все равно брошу окурок, бутылку, выкручу лампочку и т.д.

А вот у людей, живущих за рубежом, сознательность гораздо выше: видят, не видят их, но мусорить в своем подъезде они не станут. Я иногда бываю в Чехии, поэтому с полной уверенностью могу сказать, что в подъездах многоэтажных домов всегда чисто: на лестничных площадках стоят горшки с цветами, висят занавески на окнах, стены выкрашены и не исцарапаны. Следит за чистотой и порядком старший по подъезду. На нижнем этаже находится доска объявлений, на которой вывешиваются уведомления специализированных служб, помещено фото полицейского, его фамилия, имя, контактные телефоны, а также график уборки нижнего этажа и прилегающей территории возле самого дома. Ну а тот, кто не желает убирать, должен старшему по подъезду заплатить штраф в размере 100 крон. Доска объявлений оформлена очень аккуратно, на ней нет, как у нас, оборванных листовок.

Однажды посетив Нидерланды, на улицах Амстердама заметила, как не только хозяйки моют тротуар возле своих домов, но и специализированные уборочные машины вымывают улицы с шампунем. Да, до подобного уровня бытовой культуры нам еще очень далеко. Уже который год жители новой Брестской ходят и ездят по ухабам и развалинам, и никому до этого нет дела, никто не ремонтирует прилегающие территории и дороги к многоэтажкам.

Однако есть люди, которые не желают жить в грязи и сами наводят порядок в местах общего пользования. Совсем недавно мне довелось побывать в доме №24 на улице Ершова. Я была удивлена идеальной чистотой и уютом в каждом уголке этого подъезда, и чем выше этажом я поднималась, тем краше и зеленее становились лестничные площадки, картин и ковровых дорожек только не хватало. Я удивлялась тому, что должно быть нормой жизни. Просто не этажи, а зеленая оранжерея. А вот жильцы дома №1 по проспекту Независимости тоже заранее позаботились о комфортном проживании в своем новом доме и создали товарищество собственников. Их дом можно назвать образцово-показательным: корзинки с цветами находятся не только в подъезде, но и на улице, разбиты клумбы, да и о детках своих они позаботились: установили своими силами детскую площадку. Детям теперь полное раздолье.

Мы встретились с председателем товарищества собственников Юрием Апанасевичем и попросили его поделиться опытом успешной работы.

— Юрий Петрович, как возникла идея создать товарищество собственников?

— В первую очередь, это была идея самих жильцов нашего дома. Когда собственники квартир оформляли сделку купли-продажи, часто собирались, обсуждали проблемы будущего заселения, оформления и дальнейшего проживания в доме. На тот момент нам было известно, что в Республике Беларусь уже существует проекты по созданию подобного рода товариществ. Затем мы обратились за советом к директору управления магистральных газопроводов Юрию Валентиновичу Бессонову, так как он является депутатом Слонимского районного совета от нашего избирательного участка. Он одобрил нашу идею. Тогда мы организовали собрание, на которое пригласили представителей ЖКХ, потому что нам было интересно, с какими проблемами мы можем столкнуться, а у них уже есть большой опыт по обслуживанию жилья. Когда обсудили все вопросы, большинство людей проголосовали за создание товарищества собственников. Меня выбрали председателем, так как я был знаком с нормативной базой, оформили протокол, все учредительные документы были зарегистрированы. С этого момента мы начали свое самостоятельное плавание в этом направлении. Хочу заметить, что мы первые в городе создали товарищество собственников.

— Как формируете свой бюджет?

— Все денежные средства, которые мы собираем на текущий ремонт, обслуживание, и отчисления на капремонт мы контролируем сами. На собрании определяем, каким образом и на что их потратить. Нормы денежных средств мы установили такие, какие действуют в Республике Беларусь. Ежегодно отчитываемся перед общим

Председатель товарищества собственников Юрий Апанасевич

собранием за каждую копейку, поэтому каждый собственник видит, как эти денежные средства и на что расходуются. Более того, у нас в товариществе создана ревизионная комиссия, которая контролирует соблюдение финансово-хозяйственной дисциплины.

— С какими проблемами пришлось столкнуться, когда создавали свое товарищество?

— Сама процедура регистрация не сложная: собрать необходимые документы — учредительный договор, протокол собрания и копии документов собственников квартир. Пошлина за регистрацию тоже невысокая, поэтому особых трудностей на этом этапе не возникало. А вот с того момента, когда мы начали обслуживать дом, пришлось столкнуться с проблемами ремонта, ведь всегда после сдачи дома обнаруживаются строительные недоработки. Все эти проблемы жильцы обсуждали на собраниях и вносили предложения по их устранению. Мы попробовали самостоятельно решать проблемы и устранять неполадки своими силами, хотя была возможность заключить договор на обслуживание с ЖКХ. Думаем, что приняли правильное решение.

В товариществе сформирован штат работников из жильцов дома, куда входят: инженер-теплоэнергетик, рабочие по комплексной уборке, ремонту и обслуживанию, есть свой паспортист. Со всеми работниками заключены трудовые договоры. В нашем товариществе есть книга жалоб и предложений. Поскольку весь персонал живет в доме, вопросы решаем оперативно.

— Скажите, что дают такие товарищества и стоит ли в них вступать?

— На сегодняшний день организовывать такие товарищества, я считаю, стоит. Все зависит от самих жильцов, которые становятся собственниками квартир, и очень важно, чтобы они понимали, что сама по себе квартира без надлежащего обслуживания и бережного отношения к местам общего пользования существовать не может. А вот когда человек начинает контролировать денежные средства, которые ежемесячно перечисляет, только тогда он начинает бережно относиться к имуществу, которое находится в общем пользовании. Человек становится ответственным собственником и участвует в процессе управления недвижимостью, которая принадлежит не только ему одному. Жить в чистом и красивом доме, где растут цветы, все ухожено и чисто, все это не так просто и не приходит само, для этого надо приложить усилия. Это очень интересное, стоящее, хоть и нелегкое дело. Я знаю, что в Слониме есть уже желание и инициатива у жильцов нового дома на улице Тополевой организовать свое товарищество. Мы поддерживаем контакты с председателем этого дома, ведь если нас станет больше, будет легче решать проблемы и защищать свои интересы.

— Есть ли у Вас вопросы к руководству города?

— Мы поддерживаем сотрудничество с руководством города. Местный исполнительный комитет согласно законодательству оказывает субсидирование на обслуживание нашего дома. Пока мы находим с руководством взаимопонимание в

Новая детская площадка — настоящее раздолье для детворы

этом плане. Ну а проблемы всегда есть, время само подбрасывает разные нюансы. На сегодняшний день мы с работниками коммунального хозяйства планируем, как будем бороться с воронами, которые нам доставляют массу неудобств. Дело в том, что рядом с нашим домом расположен сквер, где гнездятся вороны, и с каждым годом их становится все больше. Они залетают в вентиляционные шахты, погибают там, гадят на крыше дома. В общем, жильцам нашего дома они создают множество неудобств.

Если возникают аварийные ситуации, то работники специализированных служб нам оказывают всегда помощь. Сотрудники ЖКХ нам помогали в формировании штата, в ведении документации по обслуживанию дома, правовую и организационную помощь нам оказывали, за что им большое спасибо. Мы очень благодарны депутату по нашему округу Юрию Валентиновичу Бессонову, который нам всегда помогает. У нас есть его контактный телефон, а также телефоны участкового и всех специализированных служб. Так что мы не одни в решении наших проблем и не оторваны от города.

Возможно, настанет час, когда таких товариществ в нашем городе станет больше, тогда чистота и культура поведения станут и для жильцов многоквартирных домов обычным явлением.

Анна ВОЛОДАЩУК
Фото автора

Как приятно жить в чистом и красивом доме

SMS-ВОПРОСЫ

8–029–133–04–21

▸ Планируют ли провести кабельное телевидение на улице Пушкина?

Ответ: *По словам директора ООО "Слонимское кабельное телевидение" Игоря Харитончика, в данный момент проведение кабельного телевидения на улице Пушкина не планируется.*

▸ Куда и по какому телефону можно обратиться по вопросу охраны природы?

Ответ: *По этому вопросу вы можете обратиться в Слонимскую инспекцию природных ресурсов и охраны окружающей среды по телефонам 4-72-63 или 2-39-87.*

▸ Кто разрешил в шесть часов утра на Энке под окнами людей косить газонокосилками траву?! Дайте людям спокойно отдохнуть! Не успеешь от "Оскара" вздохнуть, до трех часов ночи крик и музыка, что не уснуть, так в шесть утра косят траву! Почему не соблюдается режим труда и отдыха?! За свой покой после трудового дня скоро надо будет бороться ворошиловским методом. Пусть стригут под окнами начальства, которое разрешило им в шесть утра работать! Дайте отдохнуть!

Ответ: *Без комментариев.*

▸ Я работаю на 0,5 ставки дворником на предприятии, кошу и убираю траву на 1,5 га. Подскажите, пожалуйста, есть ли какая-то норма уборки площади для дворника?

Ответ: *В соответствии со статьей 87 Трудового кодекса Республики Беларусь установление, замена и пересмотр норм труда, в том числе норм обслуживания (площадь убираемых территорий), производится нанимателем с участием профсоюзов. Об установлении, замене и пересмотре норм труда работники должны быть извещены не позднее чем за один месяц.*

Нормы труда (нормы времени, нормы выработки, нормативы численности и др.) для организаций и учреждений в централизованном порядке не устанавливаются. С учетом этого вопросы определения площади убираемых территорий и соответственно установления численности дворников относятся к компетенции нанимателя. В качестве рекомендаций при расчете норм убираемых территорий возможно применять Нормы труда на обслуживание административных, учебных и общественных зданий, утвержденные Постановлением Министерства труда и социальной защиты Республики Беларусь от 30.06.2003 N 80. Так, в соответствии с названным документом нормы обслуживания убираемых территорий зависят от времени года, погодных условий, типа покрытия территории и других факторов.

В рабочей инструкции дворника, разрабатываемой нанимателем, наряду с обязанностями, предусмотренными соответствующей тарифно-квалификационной характеристикой, могут указываться функции по другим профессиям, периодичность их выполнения, закрепляемая территория и другие особенности.

▸ Как и где можно утилизировать старый автомобиль?

Ответ: *Для начала нужно явиться в ГАИ с техпаспортом и регистрационными знаками. Там написать заявление. Машину снимут с учёта, выдав владельцу разрезанный техпаспорт. Затем бывшему владельцу останется только прийти в ЖЭС и написать заявление с просьбой вывезти «крупногабаритный» мусор.*

▸ Кто этот талантливый дорожник, создавший прекрасную лужу на Брестской улице, у дома №63? А зимой здесь будет каток!

Ответ: *Без комментариев.*

На вопросы отвечала Екатерина БЕРЕЗОВСКАЯ

■ З НАТУРЫ

НАГРАШЫЛІ...

Сёлетнія вялікія ліўні нарабілі бяды і на маёй малой радзіме. Асабліва той дождж, што падтапіў горад Ваўкавыск і ў меншай ступені Слонім.

Крыж-абярэг у вёсцы Вострава

ФОТА МІКОЛЫ КАНАНОВІЧА

"Каб не забраў парасят з хлява — патапіліся б", — расказваў пасля стрыечны брат, а маці паскардзілася, што дажджавая вада прыйшла ў хату — ніколі раней такога не было ў нашым Востраве.

Пасля трохгадзіннай — калі ліло як з вядра — навальніцы ў Старой Перавалоцы, Засімавічах і Смаўжах дождж у многіх вяскоўцаў пазмываў агароды, вада трапіла ў гаспадарчыя пабудовы, склепы і дамы. Бедавалі па затопленых градах найбольш гаспадыні ды гараджане, якім бацькоўскія хаты засталіся ў спадчыну як лецішчы. "Ужо агуркі завязваліся, памідоры, капуста ў галоўкі бралася. Усё пад вадой апынулася. З мужам адпампоўвалі ваду з агарода — дзве помпы спалілі..." — расказвала праз пару дзён пасля ліўня гаспадыня са Смаўжоў. Жанчына паглядзела на вуду, якую я вёз у аўтобусе з горада ў вёску, і нечакана дадала: "А вуда табе цяпер навошта? У Смаўжах ды на Вялікім Млыне людзі рыбу рукамі лавілі. Проста на лузе ды каля лесу рукамі збіралі. Няма ўжо там азёраў!.." І хоць ведаў, што падчас навальніцы прарвала вада возера ў Смаўжах, а потым змыла дамбу на Вялікім Млыне, пасля тых словаў пра азёры зрабілася сумна.

Азёры нашы дастаткова вялікія (па мясцовых мерках) і прыгожыя. Яны даўно зрабіліся ўлюбёным месцам рыбалкі і адпачынку мясцовых жыхароў і прыезджых аматараў адпачынку на прыродзе. Хоць і рэдка апошнім часам, але заўсёды з вялікім задавальненнем ездзіў туды і я. Вялікі Млын — гэта мае Канары і Турэцкі бераг падчас летняга адпачынку. Шэсць гадоў таму, пасля вяселля, на Вялікім Млыне мы правялі з жонкай наш "мядовы" тыдзень. Дый для многіх маіх землякоў Вялікі Млын — больш чым проста лясное возера, дзе можна пакупацца і палавіць рыбу... Быў.

Гэта там аднойчы вясной мы засталіся на беразе каля нашых вудаў удвух з пляменнікам, а некалькі пажылых ужо мужчынаў-рыбакоў кінуліся хавацца ў лесе. Тады на дамбе спыніўся уазік інспекцыі аховы прыроды пры прэзідэнце, і з машыны да нас з аўтаматамі Калашнікава ў руках подбегам накіраваліся адразу трое інспектараў. Гэта павінна было выглядаць смешна, але мяне перапаўняла злосць, што яны прыехалі на "маё возера" пазбавіць мяне задавальнення палавіць на вуду рыбу. Хоць не паспелі тады злавіць мы з пляменнікам ніводнай рыбкі, адміністрацыйны пратакол за парушэнне прыродаахоўнага заканадаўства на мяне склалі. А праз некалькі дзён у нашай газеце выйшаў мой матэрыял, у якім спадар Халецкі — на той час кіраўнік прыродаахоўнай інспекцыі — расказваў, колькі рублёў штрафу прадугледжана за тую ці іншую злоўленую падчас нерасту рыбу. Такое было заканадаўства, што і на адну вуду з адным кручком я не меў права лавіць на Вялікім Млыне рыбу.

Цяпер вясной на адзін маршрут у ахоўнікаў прыроды стане менш. Возера Вялікі Млын не мела гаспадара, дзяржаўнае было. Як і ў Смаўжах, дзе яшчэ захаваліся назвы Літкоўскае (ад прозвішча колішняй польскай асадніцы пані Літкоўскай), ці Малы Млын.

Што ў дзяржавы знойдуцца сродкі на аднаўленне змытых стыхіяй азёраў, мясцовыя жыхары не вельмі спадзяюцца. "У Смаўжах, магчыма, яшчэ адновяць возера, калі захочуць. Там метраў трыццаць дамбы патрэбна насыпаць. А на Вялікім Млыне так усё размыла, што наўрад ці калі хто возьмецца за яго аднаўленне..." — мяркуюць мясцовыя аматары рыбалкі.

"Гэта за грахі ўсё. Грашыце, вось Бог і шле пакаранне. У вас на Тройцу дачка агарод палола — вось і навадненне!.." — нечакана патлумачыла маёй маці прычыны стыхіі суседка... Сапраўды, награшылі.

"Тут пасля дажджу прыязджалі з горада нейкія "бугры" і ўсё распытвалі, чаму азёры прарвала, хто за іх адказны, хто павінен быў застаўкі адкрыць. Застаўкі тыя даўно не працавалі, на мёртвае заварылі былі яшчэ пры Саюзе. Але, бачыш, вінаватых цяпер шукаюць", — казалі, зноў і зноў вяртаючыся да балючай тэмы, хлопцы. Цяпер для іх бліжэйшая рыбалка — лужкі і невялікае азярцо ў Старой Перавалоцы, якія ўцалелі ад стыхіі.

Мікола КАНАНОВІЧ

СЕЛЬХОЗПРОДУКЦИЯ

Наш адрес в Интернете www.gs.by

Куплю корову, быка, кабана, лошадь, телят и баранов
Тел. 4-44-69, 8-029-39-79-7-90
ИП Левкевич И.О. УНП 590083882
Лиц. №42540/1042576, 23.03.05 – 23.03.10 Слоним. РИК

ОТРУБИ КОМБИКОРМ
СВИНОЙ, КУРИНЫЙ ДЛЯ БРОЙЛЕРОВ
с доставкой на дом по городу и району.
Тел. 5-40-09, 2-22-63.
Лиц. №42540/0532261, 13.04.09-28.04.14 г. СРИК
ИП Рудак О.А. УНП 500005244

Слонимский р-н д. Рязановщина
ПРАДАЮ СВІНЕЙ (жывой вагой)
уласнай гадоўлі ад 50 - 150 кг
Кошт дагаворны.
Похороны, свадьба — СКИДКА 5 %
РАЗВЕДЕНИЕ ВЫРАЩИВАНИЕ ПРОДАЖА СВИНЕЙ
Нахождение свинарника
Кожнаму пакупніку — падарункі!
Тел.: 8-029-31-30-225, 8-029-78-01-508
Лиц. №42540/1042577 ,23 03 05-23 03 2010 ,Слоним РИК
ИП Шевчик С.И.

КУПЛЮ
телят, свиней и коров
живым весом
ПО ХОРОШЕЙ ЦЕНЕ
Тел. 2-21-52, 8-029-344-70-49
Лиц. №42540/027778, до 13.10.09 г., СРИК ИП Шешук В.И. УНП 590088989

■ ІНТЭРВ'Ю

ДЗІЛЯРА СМІРНОВА:

"МОЙ ТАТА ІОСІФ СТАБРОЎСКІ ПАДАРАВАЎ СЯЛЯНАМ 160 ГЕКТАРАЎ СВАЁЙ ЗЯМЛІ"

20 верасня Слонімскі раённы краязнаўчы музей імя Іосіфа Стаброўскага адзначыць 80-годдзе. Заснавальнікам яго быў Іосіф Стаброўскі — археолаг, краязнавец, філосаф, вынаходнік, калекцыянер, адзін са знакамітых слонімцаў XX стагоддзя. У Слоніме, на Камсамольскай вуліцы, жыве дачка Іосіфа Стаброўскага Дзіляра Іосіфаўна Смірнова. З ёю сустрэўся наш карэспандэнт і папрасіў яе згадаць пра свайго бацьку.

Іосіф Стаброўскі са сваёй першай жонкай Амеліяй Давыдоўскай, 1916 год

— Дзіляра Іосіфаўна, раскажыце трохі пра сябе.

— Я нарадзілася ў Слоніме. Вучылася ў першай беларускай школе. Потым скончыла Слонімскае медвучылішча. У 1968 годзе выехала ў Крым. Усё жыццё працавала медработнікам. Вярнулася на радзіму, жыву ў бацькоўскай хаце.

—У якім годзе Вы пакінулі Слонім?

—Пасля смерці таты ў 1968 годзе я паехала ў Крым і там як медык у санаторыі знайшла працу. Потым выйшла замуж і ўсё жыццё жыла там. Хаця кожны год наведвала родны Слонім. Цяпер вярнулася сюды назаўжды. Калі я паехала ў Крым, мама здавала кватэру навучэнцам медвучылішча і ўсім, каму неабходна было жыллё. У нас была вялікая бібліятэка, шмат чаго засталося ад спадчыны таты. Але яно ўсё прапала, знікла. Дарэчы, тата аддаў раённай бібліятэцы, якая сёння носіць імя Якуба Коласа, 6 тысяч кніг. Калі немцы зносілі спальваць кнігі на цэнтральную плошчу ў Слоніме, тата іх ноччу збіраў і прыносіў у музей, хаваў, а пасля гэтае сховішча застаўляў шафамі.

— Ці збіраў што-небудзь каштоўнае Ваш тата дома, акрамя кніг?

— Можа, і зберагаў, я не ведаю. Але ўсё каштоўнае было ў ягоным музеі.

— З кім перапісваўся Ваш тата?

—Перапіску ён вёў з усім светам. У нас быў вялікі круглы стол, дык ён быў завалены пісьмамі, кнігамі, газетамі, часопісамі. Памятаю, што перапісваўся ён з генералам Яўгенам Леашэнем. Шчыра сябраваў з паэтам Сяргеем Новікам-Пеюном. Як толькі Сяргей Міхайлавіч прыязджаў у Слонім, адразу прыходзіў да нас. Яны суткамі пра нешта вялі гутаркі, спрачаліся. А калі Сяргея Новіка-Пеюна рэпрэсавалі і саслалі ў лагер, бацька з ім пастаянна перапісваўся, а таксама дасылаў лісты ў яго абарону ў розныя інстанцыі. Тата выпісваў шмат розных перыядычных выданняў, вельмі многа чытаў. А я выпісвала медыцынскія газеты і часопісы. Прынясу дамоў, а ён кажа: "Дзе ж я іх змагу прачытаць?" Чытаў усё. Ды і зрок у яго быў добры. А што не бачыў, дык чытаў пры дапамозе лупы. І калі ён паспяваў — я не ведаю.

— Кім ён сябе лічыў — палякам, беларусам ці рускім?

— Не ведаю. Але ён быў католікам. А я лічылася дачкою памешчыка. Мяне нават не хацелі прымаць у камсамол. Але потым прынялі.

— У Орлавічах быў маёнтак Стаброўскіх. Так?

— Так. Гэта быў вялікі маёнтак. Там тата займаўся садаводствам і пчалярствам. Я там была адзін толькі раз. Памятаю вялікі дом і маленькі. У маленькім доме былі тры пакоі. Кіравала ўсімі справамі маёнтка яўрэйка Шаіна. Калі пачалася Другая сусветная вайна, яна з'ехала ў Амерыку. Таксама ў маёнтку працаваў Піліп Курыловіч, якога тата вельмі любіў і паважаў. Гэты маёнтак тату дастаўся ў спадчыну ад яго бацькоў. Мой тата падараваў бедным сялянам 160 гектараў сваёй зямлі. Нават ад сваёй вялікай ваеннай пенсіі адмовіўся.

— А чаму ён адмовіўся?

— Пенсію, ён сказаў, каб пералічвалі бедным людзям. А калі на Слонімшчыну ў 1939 годзе прыйшлі бальшавікі, нас у Орлавічах чуць не расстралялі. Нашу сям'ю ноччу з маёнтка ў Орлавічах Курыловіч на возе вывез у Слонім. А тут у нас на вуліцы Кірава жыла бабуля. У яе быў вялікі дом. Сюды мы і прыехалі ноччу. Курыловіч сказаў тату прозвішчы тых, хто нас хацеў расстраляць. Але я ўжо не памятаю. Магчыма, гэта былі супрацоўнікі НКУС. Праўда, у Слоніме нас ніхто ўжо не чапаў.

— І што стала з Вашай сядзібай у Орлавічах?

— Яе спаліў Пракоп Герасімчык разам з партызанамі. У агні згарэлі карціны мастакоў, старая мэбля, бібліятэка і ўсё, што сабралі Стаброўскія за шмат гадоў. Там быў кабінет і таты. Ён туды нікога не пускаў. Памятаю, там было шмат кніг.

— А дзе Ваш бацька браў экспанаты для музея?

— Купляў. Ён ездзіў па Беларусі і ўсё збіраў. Ён служыў на Каўказе, лавіў рыбу на Каспійскім моры, аб'ездзіў усю Расію. І каштоўныя экспанаты, якія ўдавалася дзе знайсці ці купіць, прывозіў у Слонім. У 1899 годзе ў часопісе "Исторический вестник" была надрукавана першая праца майго бацькі "К вопросу об ископаемых стеклянных шарах".

— А ці былі Вы ў музеі Вашага таты?

— Была. Памятаю ў гады вайны такі выпадак. У мяне забалела вуха. І тата мяне павёў да доктара ў ваенны нямецкі шпіталь. А ў яго на пінжаку вісеў значок "Археолаг", які ён атрымаў у пачатку XX стагоддзя. Дык немцы пыталіся ў яго, што гэта за значок. А тата ведаў нямецкую мову, і немцам ён казаў, што гэта значок называецца "Археолаг".

— Ці чапалі немцы тату падчас акупацыі Слоніма ў гады Другой сусветнай вайны?

— Мы былі ў спісах тых, каго павінны былі расстраляць немцы на Пятралевіцкай гары ў Слоніме. Аб гэтым нас папярэдзіў Сяргей Новік-Пяюн. Але потым нехта той спіс у немцаў украў, і нас ніхто не чапаў.

— Ці праўда, што Ваш тата заўсёды хадзіў у салдацкім шынялі?

— Гэта так. Не хацеў мяняць яго ні на што.

— А калі яго запрашалі на якія фэсты?

— На якія фэсты! Да вайны, наадварот, да нас у Орлавічы прыязджала шмат гасцей. Асабліва летам. А пасля вайны тату было не да фэстаў.

— Ваша мама была другой жонкай Стаброўскага?

— Так. Першая яго жонка Амелія Давыдоўская, якая нарадзіла яму сына Міраслава і дачку Ірэну, рана памерла. Другой жонкай стала мая мама Эльміра Байрашэўская. Тата за яе быў старэйшы на 37 гадоў. Яны пажаніліся ў 1930 годзе.

— Як удалося Вашаму тату пражыць 98 гадоў?

— Ён мала еў мяса і каўбас. Больш харчаваўся салатамі, садавіной і гароднінай.

— Ці бываеце Вы ў Орлавічах?

— Вельмі рэдка. Некалькі гадоў таму з сяброўкай, якая працавала ў Слонімскім аўтапарку №3, паехала на аўтобусе ў Орлавічы. Наведала родныя мясціны. А калі ад'язджала дамоў, дык мясцовыя людзі з Орлавічаў і з суседніх вёсак, калі даведаліся, што прыехала Стаброўская, на кані прывезлі да аўтобуса мне бульбы, малака, смятаны, сыроў і іншых вясковых ласункаў і пачаставалі. Я была вельмі здзіўлена і ўзрушана, калі даведалася, што ўсе гэтыя пачастункі ў знак памяці пра майго бацьку Іосіфа Стаброўскага і ўсіх Стаброўскіх разам узятых. Я тады расчулілася да слёз.

Сяргей ЧЫГРЫН

■ ИСТОРИЯ

СУДЬБЫ СЫНКОВИЧСКОГО ХРАМА

Продолжение
Начало в №631-632

Следует, прежде всего, учесть, что для встречи персон такого высокого положения требовались соответствующие условия, которые вряд ли могла предоставить какая-то деревня. Обратимся еще раз к ЛЛЖ и напомним, что названная летопись весьма позднего происхождения — начала XVIII века. Анонимный автор ЛЛЖ пользовался более ранними источниками, в которых согласно с древней орфографией все слова, в том числе и имена собственные, писались с прописной буквы. Составитель ЛЛЖ мог ошибочно принять слово «остров», употребленное в первоисточнике как топографический термин, за название местности.

Известный исследователь летописей Н. Улащик утверждает, что в ЛЛЖ имеются искажения имен и названий. Это дает нам право предположить, что и в нашем случае допущена ошибка, т.е. в первоисточнике речь шла именно о каком-то острове. Наиболее вероятно, что это был остров на реке Березе, который в смысле комфорта (замок и прочее) был вне конкуренции с любой деревней или «маёнтком» (имением). Более того, нам не известно, как в древности называлось городище на реке Березе, где проживали пруссы. Учитывая топографическую особенность этого места, скорее всего, оно и называлось Остров.

Последняя страница в истории замка на реке Березе связана с походом князя Витовта против татар на Дон в 1399 г. Пользуясь длительным отсутствием основных воинских сил, ушедших в поход, крестоносцы начали безнаказанно вторгаться в пределы ВКЛ. С весны 1399 г. и до осени 1400 г. тевтонские рыцари совершили восемь грабительских райзов (наездов), во время которых доходили до Волковыска. Несомненно, сохранившиеся свидетельства не отражают всей полноты бедствий того времени. Вполне вероятно, что крестоносцы проникали и дальше Волковыска. Видимо, в это время они добрались до прусского поселения на реке Березе. Естественно, что уничтожить обнаруженную колонию беглецов для тевтонцев было делом принципа. Таким образом, в 1400 году городище на реке Березе было уничтожено. Достоверность такого предположения подтверждается тем, что в более позднее время переселенцы-пруссы в истории ВКЛ не упоминаются: часть их была, видимо, перебита, а остальные же рассеялись по территории ВКЛ.

Окончательная судьба замка определилась не без участия князя Витовта, непосредственным владельцем этого края. Поскольку замок оказался «бесхозным» (вероятно, в какой-то степени и поврежденным), к тому не имеющим стратегического значения, было решено использовать его для религиозных целей. Объем таких работ, безусловно, не мог быть осуществлен без финансовой поддержки на высоком великокняжеском уровне. Известно, что Витовт посещал эти края, а именно в 1407 г. Видимо, в это время была освящена нынешняя церковь Архистратига Божия Михаила, что в Сынковичах, скорее всего, во время визита 1405 г. Витовт определил судьбу заброшенного замка, а в 1407 г. проверил исполнение своего указания.

Протоиерей Виталий АНТОНИК

ВОПРОС — ОТВЕТ

ОТЧУЖДАТЬ ИМУЩЕСТВО НЕЛЬЗЯ

Слонимчанка Светлана Н. по телефону рассказала, что у нее в семье возникли проблемы и она собирается подавать заявление в суд на развод. В прошлом году они с мужем купили дорогой автомобиль, который по договору купли-продажи оформлен на мужа. Чтобы машина не досталась жене, супруг хочет оформить дарственную на свою мать или продать автомобиль, чтобы после развода купить себе другой. Может ли он так поступить?

На основании ст. 23 Кодекса Республики Беларусь о браке и семье (КоБС), «имущество, нажитое супругами в период брака, независимо от того, на кого из супругов оно приобретено либо на кого или кем из супругов внесены денежные средства, является их общей совместной собственностью. Супруги имеют равные права владения, пользования и распоряжения этим имуществом, если иное не предусмотрено Брачным договором». Исходя из этого, машина на праве общей собственности принадлежит супругам поровну, то есть по 1/2 части.

